Голас Радзімы

№ 28 (1910)
11 ліпеня 1985 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Інстытут цепла- і масаабмену — адна з буйнейшых даследчых устаноў Акадэміі навук Беларусі. Тут працуе 13 дактароў і больш за 130 кандыдатаў навук. Работай калектыву кіруе вядомы савецкі вучоны член-карэспандэнт АН СССР, акадэмік АН БССР, лаўрэат Ленінскай прэміі Рэм Салаухін.

На працягу многіх гадоў інстытут з'яўляецца галаўной арганізацыяй у краіне па вырашэнню праблем распрацоўкі і ўкаранення новых цепла- і масаабменных тэхналагічных працэсаў і апаратаў для нагрэву, тэрмаапрацоўкі, сушкі вырабаў і матэрыялаў. Прылады, распрацаваныя вучонымі інстытута, знаходзяць прымяненне ў сістэмах ахаладжэння трансфарматараў, у рухавіках унутранага згарання, для тэрмастабілізацыі вырабаў. Эканамічны эфект ад укаранення ў народную гаспадарку гэтых і іншых распрацовак толькі за апошнія чатыры гады склаў больш за 40 мільёнаў рублёў.

Інстытут актыўна супрацоўнічае з навуковымі цэнтрамі за межамі Савецкага Саюза. Найбольш трывалыя кантакты падтрымліваюцца з краінамі сацыялістычнай садружнасці. У 1973 годзе пры інстытуце быў створаны Міжнародны цэнтр акадэмій навук сацыялістычных краін для павышэння кваліфікацыі навуковых кадраў па праблеме «Цепла- і масаабмен».

Пашыраюцца таксама кантакты з вучонымі капіталістычных краін. Беларускія навукоўцы супрацоўнічаюць са сваімі калегамі з Францыі, Італіі, ФРГ, Вялікабрытаніі, ЗША і іншых дзяржаў.

НА ЗДЫМКАХ: начальнік змены Галіна ВІКТАРОВІЧ і інжынер-радыёэлектронік Марына АЛЯКСАНДРАВА ў вылічальным цэнтры калектыўнага карыстання; рэаэлектрычны рухавік — адна з распрацовак вучоных Інстытута цепла- і масаабмену; маладшы навуковы супрацоўнік Сяргей ЛАБУДА і інжынер Алена ЛАВІНСКАЯ.

Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.





падзеі • людзі • факты

СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

2 і 3 ліпеня ў Маскве праходзіла трэцяя сесія Вярхоўнага Савета СССР адзінаццатага склікання.

На сумесным пасяджэнні дэпутатаў абедзвюх палат Вярхоўнага Савета, Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей, было разгледжана пытанне аб выбранні Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Па прапанове Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова, з якой ён выступіў ад імя ЦК КПСС і Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, дэпутаты аднагалосна выбралі Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Андрэя Грамыку.

Як вядома, А. Грамыка з 1957 года быў міністрам замежных спраў СССР, а з 1983 года — першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР і адначасова міністр замежных спраў СССР. Нарадзіўся ён у 1909 годзе ў вёсцы Старыя Грамыкі цяпер Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці Беларускай ССР.

Сесія таксама разгледзела пытанне аб змяненнях у саставе Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Вярхоўны Савет СССР прыняў пастанову аб выбранні членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР дэпутата М. С. Гарбачова.

На сесіі з прапановай аб назначэнні міністрам замежных спраў СССР Эдуарда Шэварднадзе выступіў Старшыня Савета Міністраў СССР М. Ціханаў.

Вярхоўны Савет СССР аднагалосна назначыў Э. Шэварднадзе міністрам замежных спраў СССР.

Вярхоўны Савет СССР разгледзеў пытанне аб выкананні патрабаванняў заканадаўства аб ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў, з дакладам па якім выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР З. Нурыеў.

На сесіі разгледжаны таксама і іншыя пытанні.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР А. ГРАМЫКА.

Міністр замежных спраў СССР Э. ШЭВАРДНАДЗЕ.

ГОСЦІ З-ЗА МЯЖЫ

РАБОЧАЯ ГРУПА

На Магілёўшчыне знаходзілася рабочая група па пытаннях будаўніцтва з Габраўскай акругі Народнай Рэспублікі Балгарыі.

У Магілёве члены групы ўсклалі кветкі да помніка У. І. Леніну, да мемарыяла «Барацьбітам за Савецкую ўладу».

Балгарскія таварышы наведалі праектны інстытут «Магілёўграмадзянпраект», азнаёміліся з забудовай мікрараёнаў абласнога цэнтра, з некаторымі асаблівасцямі будаўніцтва вытворчых карпусоў аб'яднання шаўковых тканін і домабудаўнічага камбіната.

У час наведання Бабруйска госці мелі гутарку ў гарвыканкоме аб перспектывах развіцця горада, азнаёміліся з арганізацыяй работ на шэрагу будаўнічых аб'ектаў.

У калгасе «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага Кіраўскага раёна балгарскія сябры цікавіліся пытаннямі сельскага будаўніцтва, перспектывай развіцця гаспадаркі.

ДЭЛЕГАЦЫЯ З ПОЛЬШЧЫ

У рэспубліцы знаходзілася дэлегацыя членаў ЦК ПАРП, якія працуюць у сельскай гаспадарцы. Яны знаёміліся з вопытам работы партыйных арганізацый аграпрамысловага комплексу Беларусі.

Польскія таварышы былі прыняты ў ЦК КПБ.

Госці наведалі гістарычныя і памятныя месцы рэспублікі, усклалі кветкі да Вечнага агню мемарыяльных комплексаў «Брэсцкая крэпасць-герой» і «Хатынь», наведалі Курган Славы і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Два дні дэлегацыя знаёмілася з сельскагаспадарчай вытворчасцю Мінскай вобласці. Польскія сябры былі гасцямі рабочых Мінскага вытворчага аб'яднання па птушкагадоўлі і Нясвіжскага раённага аб'яднання Сельгастэхнікі, хлебаробаў калгасаў «Нёман» Стаўбцоўскага і імя Калініна Нясвіжскага раёнаў.

Дэлегацыя пабывала таксама ў Магілёўскай вобласці.

ПОЕЗД ДРУЖБЫ

САРДЭЧНЫЯ СУСТРЭЧЫ

Трывалыя вузы дружбы звязваюць Міншчыну і Патсдамскую акругу (ГДР). Традыцыйнымі сталі абмены дэлегацыямі, турысцкімі групамі, калектывамі самадзейнасці.

У Мінску пабываў чарговы поезд дружбы з ГДР. На Прывакзальнай плошчы адбыўся мітынг.

Нямецкія сябры зрабілі экскурсію па гораду, усклалі кветкі да помніка У. І. Леніну і на плошчы Перамогі да помніка-абеліска.

Цёплымі і сардэчнымі былі сустрэчы на прамысловых прадпрыемствах, чыгунцы, у санаторыях, прафілакторыях, піянерскіх лагерах.

Госці з Патсдама зрабілі паездку ў Хатынь і на Курган Славы, наведалі Музей беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах, агледзелі спартыўны комплекс.

БССР І ЮНЕСКО

МІЖНАРОДНЫ СІМПОЗІУМ

У Мінску ў адпаведнасці з кантрактам, заключаным камісіяй Беларускай ССР па справах ЮНЕСКО з сакратарыятам ЮНЕСКО, закончыў работу міжнародны сімпозіум па пытаннях падрыхтоўкі персаналу, занятага пазашкольнай навуковай работай моладзі. Яго адкрыў старшыня арганізацыйнага камітэта па правядзенню сімпозіума, першы намеснік міністра асветы БССР М. Круглей. Са словамі прывітання і пажаданнем плённых поспехаў у рабоце да яго ўдзельнікаў ад імя ўрада Беларускай ССР звярнулася намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Мазай.

Аб мэтах і задачах сімпозіума, важнасці разглядаемага пытання падрыхтоўкі кваліфікаванага персаналу для пазашкольнай навуковай работы з падрастаючым пакаленнем гаварыла ў сваім выступленні прадстаўнік Генеральнага дырэктара ЮНЕСКО С. Хагіс.

На пасяджэннях міжнароднага сімпозіума выступілі прадстаўнікі Бангладэш, Венесуэлы, Туніса, Францыі, Ямайкі, Швецыі, Тайланда, ГДР, Замбіі і іншых краін свету.

Удзельнікі сімпозіума азнаёміліся з работай Рэспубліканскай станцыі юных тэхнікаў і школы юных матэматыкаў пры Інстытуце матэматыкі АН БССР, а таксама наведалі мемарыяльны комплекс «Хатынь» і пабывалі на Кургане Славы.

РАСПРАЦОЎКІ ВУЧОНЫХ

КЕРАМІКА ДЛЯ ЭЛЕКТРОННАЙ ТЭХНІКІ

Керамічныя вырабы, як вядома, валодаюць вялікай цвёрдасцю, электраізаляцыйнымі ўласцівасцямі, не паддаюцца акісленню і карозіі. Гэтыя якасці пашырылі магчымасці іх выкарыстання ў розных галінах вытворчасці. Распрацоўкай новых тэхналогій атрымання керамікі для электроннай тэхнікі займаецца група супрацоўнікаў лабараторыі высокіх ціскаў Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў АН БССР. Адзін са створаных тут матэрыялаў прызначаны для вырабу кандэнсатараў. Яго прымяненне дазваляе павялічыць ёмістасць кандэнсатараў у 3-4 разы пры тых жа размерах. З гэтага матэрыялу атрымліваюць таксама мікракандэнсатары з высокімі эксплуатацыйнымі характарыстыкамі, кандэнсатарныя пасты.

Прапанавалі вучоныя і новы спосаб атрымання п'езакерамікі, што дае магчымасць значна знізіць кошт вытворчасці і павысіць якасць фільтраў гукавога і відэаканалаў каляровых тэлевізійных прыёмнікаў.

Гэтыя і некаторыя іншыя распрацоўкі ўжо ўкаранёны на прадпрыемствах Масквы, Адэсы і Мінска.

СЯБРОЎСКІЯ СУВЯЗІ

ЭКСПАНАТЫ З ЧССР

Каля 20 гадоў сябруюць працоўныя Жлобінскага раёна Беларусі і Пелгржымаўскага раёна Чэхаславакіі. Цесныя сувязі паміж сабой наладзілі калектывы прамысловых прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў, устаноў культуры.

З цікавасцю знаёмяцца жыхары Жлобіна з новымі матэрыяламі, якія чэхаславацкія сябры перадалі гарадскому музею. Гэта кнігі, буклеты, работы народных майстроў брацкай краіны. Адзін з самых дарагіх экспанатаў — бюст У. І. Леніна.

ВЫСТАЎКІ

ДЛЯ АМАТАРАЎ ПАДАРОЖЖАЎ

Аб розных экскурсійных маршрутах па ГДР расказвае аматарам падарожжаў выстаўка турысцкай фірмы «Райзебюро» «ГДР — краіна турызму, краіна сяброў». Яна адкрылася ў Мінску ў фае кінатэатра «Масква». Фатаграфіі і праспекты прадстаўляюць рамантычныя Рудныя горы, «зялёнае сэрца» ГДР — Цюрынгію, гарады брацкай краіны.

120 тысяч савецкіх турыстаў, у тым ліку і з Беларусі, зробяць сёлета захапляючае падарожжа па ГДР. Яны пазнаёмяцца з дасягненнямі брацкай краіны, багацейшымі калекцыямі твораў мастацтва, агледзяць гістарычныя і архітэктурныя помнікі. У сваю чаргу Савецкі Саюз штогод наведваюць сотні тысяч турыстаў з ГДР. Захапляючыя экскурсіі аматараў падарожжаў па брацкіх краінах, іх сустрэчы на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, на вечарах дружбы ў культурных цэнтрах служаць умацаванню ўзаемаразумення і міру на зямлі.

ДА ФАЛЬКЛОРНАГА ФЕСТЫВАЛЮ

«НЁМАН» ПАЕДЗЕ Ў ГРЭЦЫЮ

Да паездкі ў Грэцыю рыхтуецца народны ансамбль песні і танца «Нёман» Гродзенскага гарадскога Дома культуры. Калектыў прыме ўдзел у фальклорным фестывалі, які адбудзецца сёлета ў жніўні.

У праграме, з якой выступіць ансамбль, звыш 20 нумароў. Сваё майстэрства пакажуць і ўдзельнікі танцавальнай групы. Яны выканаюць беларускія народныя танцы, а таксама танцы народаў СССР. У праграму ўключаны фальклорна-абрадавая кампазіцыя «Юр'я», вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі «Прынёманская кадрыля» і зімовыя беларускія народныя гульні «Мяцеліца».

На фестывалі адбудуцца творчыя сустрэчы з фальклорнымі ансамблямі іншых краін. Самадзейныя артысты з горада над Нёманам раскажуць аб творчым шляху свайго калектыву, аб тым, як развіваюцца культура і мастацтва ў гарадах і вёсках Беларусі.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

ПЕРАДАЧА — ПА КАБЕЛЮ

Не за гарамі той час, калі ва ўсіх буйных гарадах нашай краіны тэлегледачы змогуць прымаць перадачы не праз эфір, а па спецыяльнаму кабелю.

Яго галоўная вартасць — нязначны ўзровень перашкод. Асабліва мэтазгодна прымяненне кабелю ў зонах няўпэўненага прыёму.

Абсталяванне для сістэм кабельнага прыёму пачаў выпускаць гродзенскі завод «Радыёпрыбор», які ўваходзіць у склад вытворчага аб'яднання «Гарызонт».

ПОМНІКІ ПРЫРОДЫ

ПАД АХОВАЙ — ДРЭВЫ

Помнікам прыроды рэспубліканскага значэння аб'яўлены масівы рэдкай елкі — карпацкай горнай расы ў Брэсцкім лясгасе. Гэтыя дрэвы даюць высокі прырост драўніны, устойлівыя да хвароб. Тут жа прыжыўся занесены ў Чырвоную кнігу БССР вечназялёны плюшч.

Багаты і разнастайны раслінны свет Палесся. Цуд прыроды — балотны кіпарыс, прадстаўнік трацічнай флоры, узяты пад ахову дзяржавы ў Парэцкім парку, які раскінуўся на 60 гектарах уздоўж маляўнічых берагоў Ясельды.

У парку-запаведніку, які стаў прыроднай лабараторыяй, доследную работу вядуць дэндролагі Целяханскага лясніцтва, студэнты-лесаводы.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

НЯСВІЖ. У калгасе «Радзіма» створаны гісторыка-краязнаўчы музей. Яго экспазіцыя знаёміць наведвальнікаў з гісторыяй гаспадаркі, яе слаўнымі людзьмі. У музеі афармлены і этнаграфічны куток, дзе змешчаны прадметы хатняга ўжытку мінулых часоў, нацыянальнае адзенне.

Асаблівае месца ў музейнай экспазіцыі займае раздзел, прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне.

ГРОДНА. Тут ажыццёўлены прагрэсіўны варыянт забудовы жылых кварталаў. Яны ўзведзены ў комплексе з вытворчымі прадпрыемствамі. Жыхарам чатырох новых мікрараёнаў не патрэбен транспарт, каб дабірацца на работу: прадпрыемствы знаходзяцца побач, у масіве «Паўночны», пабудаваным як адзіны прамыслова-жылы комплекс.

КАСЦЮКОВІЧЫ. Фонды літаратурнага музея Аркадзя Куляшова, што адкрыты на яго радзіме ў вёсцы Саматэвічы, папоўніліся новымі экспанатамі.

Свае творы сюды даслалі паэты, лаўрэаты прэміі імя А. Куляшова Аляксей Русецкі, Ніна Мацяш, лаўрэат прэміі імя Я. Купалы Мікола Аўрамчык, паэт Максім Лужанін.

Космас павінен служыць міру

Адказ М. С. Гарбачова на зварот «Саюза занепакоеных вучоных»

Паважаны пан Кендал,

я атрымаў накіраваны Вамі ад імя «Саюза занепакоеных вучоных» зварот з заклікам аб забароне касмічнай зброі. Хачу сказаць, што адношуся з глыбокай павагай да думкі вядомых прадстаўнікоў навукі, якія больш ясна, чым многія іншыя, разумеюць, да якіх небяспечных вынікаў для чалавецтва прывяло б распаўсюджанне гонкі ўзбраенняў на касмічную прастору, ператварэнне яе ў арэну ваеннага саперніцтва.

«Саюз занепакоеных вучоных» абгрунтавана патрабуе, каб было прынята дакладнае і беспаваротнае палітычнае рашэнне, якое прадухіліла б мілітарызацыю касмічнай прасторы, пакінула яе свабоднай для мірнага супрацоўніцтва. Сапраўды, гэта праблема патрабуе смелага падыходу. Тут наўрад ці прымянімыя меркі ўчарашняга дня, вузкія ўяўленні аб аднабаковых выгадах і перавагах, да таго ж ілюзорных. Цяпер, як ніколі, патрэбна палітыка дальнабачная, заснаваная на разуменні рэальнасцей і тых небяспек, з якімі мы непазбежна сустрэнемся заўтра, калі сёння тыя, хто можа і павінен прыняць адзіна правільнае рашэнне, ухіляцца ад адказнасці, што ляжыць на іх.

Ад імя савецкага кіраўніцтва хачу з усёй пэўнасцю заявіць, што Савецкі Саюз не пойдзе першым са зброяй у космас. Мы будзем прыкладаць усе намаганні, каб пераканаць і іншыя краіны, перш за ўсё Злучаныя Штаты Амерыкі, не рабіць такога фатальнага кроку, які непазбежна павялічыў бы пагрозу ядзернай вайны, даў бы штуршок бескантрольнай гонцы ўзбраенняў па ўсіх напрамках.

Зыходзячы з гэтай мэты, Савецкі Саюз, як Вам відавочна, вядома, унёс у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый радыкальную прапанову — праект дагавора аб забароне прымянення сілы ў касмічнай прасторы і з космасу ў адносінах да Зямлі. Калі б ЗША далучыліся да пераважнай большасці дзяржаў, якія падтрымалі гэту ініцыятыву, то пытанне аб касмічнай зброі можна было б закрыць раз і назаўсёды.

На савецка-амерыканскіх перагаворах па ядзерных і касмічных узбраеннях у Жэневе мы імкнёмся дагаварыцца аб поўнай забароне на стварэнне, выпрабаванні і разгортванне ўдарных касмічных сістэм. Такая забарона дазволіла б не толькі захаваць космас для мірнага асваення, даследаванняў і навуковых адкрыццяў, але і пачаць працэс рэзкага скарачэння і знішчэння ядзернай зброі.

Мы не раз рабілі і аднабаковыя крокі, закліканыя падаць добры прыклад Злучаным Штатам. Вось ужо два гады дзейнічае ўведзены Савецкім Саюзам мараторый на вывад у касмічную прастору проціспадарожнікавай зброі, і ён будзе дзейнічаць да таго часу, пакуль іншыя дзяржавы будуць рабіць такім жа чынам. На стале ў Вашынгтоне ляжыць наша прапанова аб тым, каб абодва бакі поўнасцю спынілі работы па стварэнню новых проціспадарожнікавых сродкаў, а ўжо наяўныя ў СССР і ЗША такія сродкі, у тым ліку і тыя, выпрабаванні якіх не завершаны, былі б знішчаны. Дзеянні амерыканскага боку ўжо ў бліжэйшы час пакажуць, якому рашэнню аддасць перавагу адміністрацыя ЗША.

Стратэгічная стабільнасць, давер'е, несумненна, умацаваліся б, калі б ЗША згадзіліся разам з СССР у абавязваючай форме пацвердзіць сваю прыхільнасць да рэжыму бестэрміновага Дагавора па абмежаванню сістэм проціракетнай абароны. Савецкі Саюз не стварае ўдарных касмічных узбраенняў, шырокамаштабнай сістэмы ПРА, таксама як і асновы для такой абароны, строга вытрымлівае свае абавязацельствы па дагавору ў цэлым і ў прыватнасцях, няўхільна выконвае дух і літару гэтага важнейшага дакумента. Мы запрашаем амерыканскае кіраўніцтва далучыцца да нас у гэтай справе, адмовіцца ад выношваемых планаў мілітарызацыі космасу, якія непазбежна прывядуць да ломкі гэтага дакумента — ключавога звяна ўсяго працэсу абмежавання ядзерных узбраенняў.

СССР зыходзіць з таго, што практычнае вырашэнне задачы недапушчэння гонкі ўзбраенняў у космасе і спынення яе на Зямлі магчыма пры наяўнасці ў абодвух бакоў палітычнай волі, шчырага жадання дабівацца гэтай гістарычнай мэты. У Савецкага Саюза такое жаданне і такая воля ёсць.

Жадаю «Саюзу занепакоеных вучоных», усім яго членам поспехаў у высакароднай дзейнасці на карысць міру і прагрэсу.

З павагай М. ГАРБАЧОЎ

***

Вядомая амерыканская грамадская арганізацыя «Саюз занепакоеных вучоных», якая аб'ядноўвае некалькі соцень відных вучоных — членаў Нацыянальнай акадэміі навук ЗША, звярнулася нядаўна да Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова і прэзідэнта ЗША Р. Рэйгана з заклікам аб тым, каб СССР і ЗША дагаварыліся аб поўнай забароне на стварэнне і выпрабаванні касмічных узбраенняў, а тым часам устанавілі б узаемны мараторый на далейшыя выпрабаванні проціспадарожнікавай зброі і пацвердзілі сваю вернасць Дагавору 1972 года аб абмежаванні сістэм проціракетнай абароны.

(ТАСС)

НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС У ІНТАРЭСАХ КРАІНЫ І РЭГІЁНА

ГАЛОЎНАЯ МЭТА—ДАБРАБЫТ НАРОДА

Як спалучаюцца перспектывы навукова-тэхнічнага прагрэсу (НТП) з рэгіянальнымі асаблівасцямі сацыяльна-эканамічнага развіцця саюзных рэспублік? У гутарцы з нашым карэспандэнтам аб гэтым расказвае доктар эканамічных навук, намеснік дырэктара Інстытута эканомікі Акадэміі навук Беларусі Людміла КАЗЛОЎСКАЯ.

— Галоўная мэта планавання і кіравання НТП — максімальна падпарадкаваць рэгіянальныя асаблівасці развіцця навукі, тэхнікі і вытворчасці рашэнню стратэгічнай задачы сацыялістычнага грамадства: больш поўнаму задавальненню матэрыяльных і духоўных патрэб чалавека, — падкрэсліла Людміла Казлоўская. — Гэтай мэце служыць распрацаваны савецкімі вучонымі небывалы па маштабах і глыбіні прагноз — Комплексная праграма навукова - тэхнічнага прагрэсу СССР на 1986—2005 гады. Беларусь, як вядома, неад'емная частка народнагаспадарчага комплексу краіны. Таму аналіз перспектыў яе навуковага і эканамічнага патэнцыялу стаў састаўной часткай гэтай праграмы, якая з'яўляецца галоўным перадпланавым дакументам пры складанні Асноўных напрамкаў развіцця народнай гаспадаркі на дзесяцігоддзе і дзяржаўных заданняў на пяцігодкі.

— Сацыяльныя мэты, напэўна, таксама адрозніваюцца ў залежнасці ад узроўню дасягненняў, дэмаграфічных і іншых умоў кожнай рэспублікі?

— Вызначэнне гэтых асаблівасцей было першым этапам нашага даследавання, у якім удзельнічалі больш за 150 навуковых, праектных і гаспадарчых устаноў. Карціна высветлілася такая. Разам з агульнымі задачамі (паляпшэнне забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання і непрадуктовымі таварамі ў адпаведнасці з навукова абгрунтаванымі нормамі, далейшае будаўніцтва жылля, развіццё медыцынскага і камунальна - бытавога абслугоўвання і г д.) ёсць праблемы асабліва актуальныя ў нашым рэгіёне. Адна з іх — карэнная аптымізацыя сістэмы рассялення. Гістарычна склалася так (вынікі войн, якія спусташалі нашу зямлю), што ў Беларусі пераважаюць невялікія гарады з насельніцтвам да 10 тысяч чалавек. У сельскай мясцовасці, побач з сучаснымі аграпасёлкамі, нямала дробных вёсачак. Усё гэта ўскладняе паляпшэнне культурна-бытавога абслугоўвання насельніцтва, павышэнне жыллёва-камунальнага камфорту. Таму вучоныя прапанавалі стварэнне прынцыпова новай сістэмы рассялення, узаемазвязанага развіцця гарадоў, сельскіх населеных пунктаў і зон адпачынку. Сацыяльны сэнс такога праекта ў тым, каб забяспечыць усім катэгорыям жыхароў роўную прасторава-часавую даступнасць да культурных і бытавых даброт, разнастайнасць у выбары відаў і форм дзейнасці і адпачынку. Карацей кажучы, праект прадугледжвае пераход ад традыцыйнага аўтаномнага да ўзаемазалежнага развіцця ўсіх населеных пунктаў. Па прапанове вучоных ужо пачата стварэнне своеасаблівых «сузор'яў» з вялікіх, малых гарадоў і прылягаючых да іх сельскіх пасёлкаў, якія дапаўняюць адзін аднаго ў агульнай сацыяльна-эканамічнай інфраструктуры. На базе разрозненых сельскіх устаноў культуры цяпер арганізавана больш за 1 000 цэнтралізаваных клубных сістэм і сацыяльна-культурных комплексаў. Іх супрацоўнікі разам і таму больш эфектыўна вядуць работу па арганізацыі вольнага часу вяскоўцаў.

Праект даволі маштабны. Але рэспубліка ажыццяўляе яго не толькі ўласнымі сіламі. Планавыя органы краіны ўжо сёння прагназіруюць з яго ўлікам размяшчэнне новых прадпрыемстваў, сеткі дарог, пераважнае фінансаванне будаўніцтва культурна-бытавых аб'ектаў. Такі комплексны падыход дазваляе загадзя паклапаціцца і аб мерах па ахове навакольнага асяроддзя.

— Дарэчы, галоўны «папрок» навукова - тэхнічнаму прагрэсу звычайна робіцца за тое, што ён шкодзіць прыродзе.

— Шкодзіць не сам навукова-тэхнічны прагрэс, а метады выкарыстання яго дасягненняў. Там, дзе галоўная мэта развіцця толькі дасягненне дадатковага прыбытку, церпіць не толькі прырода, але і людзі. Наш жа прагноз пацвярджае: пры планавым гаспадаранні, мэта якога сацыяльныя дасягненні, адмоўнае ўздзеянне на прыроду тэхнагенных фактараў можна спыніць. Прыклад — рашэнне такой спецыфічнай рэгіянальнай праблемы, як масавая меліярацыя зямель.

У Беларусі скарыстоўваюцца ўжо больш чым 2,5 мільёна гектараў раней пераўвільготненых зямель, дзе атрымліваюць каля трэці прадукцыі раслінаводства. На першым этапе з-за недасканаласці меліярацыйных сістэм і сапраўды ўзнікла пагроза парушэння воднага балансу, у прыватнасці, на Палессі. Але становішча неўзабаве выправілі, стварыўшы там сетку штучных вадасховішчаў, асушальна-абвадняльных сістэм і запаведных тэрыторый. Балоты саступаюць месца палям, але вада ў рэгіёне захоўваецца, і небяспека для унікальных прыродных комплексаў мінула.

— Якія характэрныя для рэспублікі шляхі прадказвае навука ў выкарыстанні іншых відаў рэсурсаў — працоўных, мінеральна - сыравінных, энергетычных?

— Прырост працоўных рэсурсаў, на жаль, будзе скарачацца — сказваюцца вынікі мінулай вайны, калі ў Беларусі загінуў кожны чацвёрты жыхар. Шляхоў вырашэння праблемы некалькі. Дасканаласць дэмаграфічнай палітыкі прадугледжвае прымаемыя ўсюды ў СССР меры па стымуляванню нараджальнасці, ахове мацярынства і дзяцінства, уліку структуры сямей пры праектаванні жылля. Другі важнейшы напрамак — рацыянальнае выкарыстанне працаздольнага насельніцтва. Гэта рэзкае павышэнне прадукцыйнасці працы на падставе дасягненняў НТП, ліквідацыя цяжкай фізічнай і нецікавай ручной працы.

Вядучае месца сярод сыравінных рэсурсаў у нас займае калійная руда (больш за 50 працэнтаў саюзнага выпуску калійных угнаенняў). Ад навукова-тэхнічнага прагрэсу мы чакаем перш за ўсё вырашэння праблемы комплекснай утылізацыі адходаў яе здабычы і ўзбагачэння. Тут таксама вельмі істотнай будзе дапамога шэрагу саюзных органаў: распрацоўка і пастаўка новага абсталявання, выкарыстанне вынікаў даследаванняў буйнейшых навуковых цэнтраў краіны.

Выключна новая галіна з'явіцца ў беларускай энергетыцы: выкарыстанне мясцовых гаручых сланцаў і бурых вугаляў. Нам гэта вельмі выгадна — эканомяцца нафта і газ. Комплекснае выкарыстанне новай сыравіны абяцае адначасова атрыманне воску, біястымулятараў, аргана-мінеральных угнаенняў, актыўных вугалёў і разнастайных будаўнічых матэрыялаў.

— Якая роля ў вырашэнні гэтых і іншых перспектыўных сацыяльна-эканамічных праблем удзяляецца беларускай навуцы?

— Узнікнуць новыя напрамкі фундаментальных даследаванняў. Гэта — распрацоўка працэсаў атрымання металічных вырабаў з зададзенымі ўласцівасцямі, робататэхнічных сістэм, вылічальных машын на базе мікрапрацэсараў і схем з матрычнай структурай, распрацоўка рэгіянальных навуковых прынцыпаў канструявання прыродна-тэхнагенных сістэм і кіравання імі, стварэнне біятэхналогіі атрымання бялковых рэчываў з расліннай сыравіны, даследаванне новых форм і метадаў арганізацыі проціракавай барацьбы...

— Як відаць нават з простага пераліку, развіццё даследаванняў у значнай меры арыентуецца на патрэбнасці народнай гаспадаркі, вырашэнне актуальных сацыяльных і прыродаахоўных праблем, — сказала ў заключэнне нашай гутаркі Людміла Казлоўская. — Такім чынам, навука мае ў рэзерве і заўсёды будзе мець дастаткова сродкаў, каб кожны з нас мог з аптымізмам глядзець у будучыню.

В. УЛАДЗІМІРАЎ.



Вёска Батвінаўка, што ў Крычаўскім раёне Магілёўскай вобласці, значна вырасла за апошнія гады. Гэта звязана з інтэнсіўным будаўніцтвам жылля і сацыяльна-культурных аб'ектаў, якое вядзецца на сродкі мясцовага калгаса «Звязда».

НА ЗДЫМКУ: вуліца Маладзёжная, дзе жывуць пераважна маладыя сем'і калгаснікаў, адна з нядаўніх вясковых новабудоўляў.

Фота В. БЫСАВА.

БЕЛАРУСЬ ВАЧАМІ ЗАРУБЕЖНЫХ СЯБРОЎ

ПЯШЧОТНАЯ І МУЖНАЯ

Сотні дэлегацый і турысцкіх груп з многіх краін свету наведваюць штогод нашу рэспубліку, якая адной з першых прыняла на сябе ўдар фашысцкай ваеннай машыны. Такія паездкі, па прызнанню нашых замежных гасцей, з'яўляюцца для іх наглядным урокам мужнасці і гераізму, праяўленых беларускімі патрыётамі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Чэхаславацкая журналістка Эва ТРАНЧЫКАВА праехала па выдатных мясцінах Беларусі з групай піянераў. На старонках славацкіх часопісаў яна падзялілася сваімі ўражаннямі ад паездкі. Друкуем іх у скарочаным перакладзе са славацкай мовы.

ПАЛІТЫЯ КРЫВЁЮ КАМЯНІ

...Як часта калісьці мяне ахопліваў жах толькі пры адной згадцы пра Пампею, пра яе разбураныя дамы, руіны палацаў, акамянелыя астанкі дзяцей, мацярок, бацькоў. Страх яшчэ павялічваўся ад усведамлення таго, што бяда ўварвалася нечакана і назаўжды перапыніла спакойную плынь мірнага жыцця людзей. І мёртвы камень яшчэ дагэтуль — праз стагоддзі — адкрывае нам карціны чалавечых пакут.

...Я размаўляла з каменем. Але не пад гарачымі промнямі паўднёвага сонца і не на схіле Везувія. Я размаўляла з каменем у краі на ўсход ад нас, на беразе ракі Буг — там, дзе серабрацца першыя беластволыя бярозкі светлавалосай Беларусі. Яшчэ і сёння там камень, паліты крывёю, апавядаў мне пра яе пакуты і пра гераізм. І я не плакала, у мяне ўжо не было слёз, я думала пра тое, што руіны крэпасці, гэтае сховішча жахаў і пакут, стварыла не сляпая прырода, гэта зрабіла зброя ў руках чалавека.

Тут, за паласатым слупам на прыгранічнай паласе, я адкрыла для сябе кнігу нядаўняй і ўсё ж далёкай гісторыі гэтага краю і перагарнула яе пажоўклыя старонкі.

Дваццаць другога чэрвеня 1941 года... Самая кароткая ноч стала мяжой паміж мірам і вайной. Нечакана, знянацку перапыніўшы мірную плынь жыцця людзей. Гэтак жа, як у Пампеі, толькі страшней...

Я схіляю галаву перад тваёй мужнасцю, крэпасць. Перад табой, не перад мёртвым каменем. Бо можна прабіць якія хочаш тоўстыя муры, можна змесці са шляху самыя неадольныя перашкоды, толькі адзіную перашкоду нельга адолець — гонар, веру і мужнасць чалавечую. Перад імі я схіляю галаву.

Кветкі, якія я кладу на камень, — вам, гераічныя абаронцы Брэста. Пашана вашай памяці! Стаю, нізка схіліўшы галаву перад табой, крэпасць-Герой! Кроплі дажджу сплываюць па тваіх камянях. Як кроплі слёз. Колькі ўжо гадоў абмываюць яны твае камяні, ды так і не могуць змыць з іх крыві. І яна, кроў гэтая, кроў сумленных і мужных людзей, як перасцярога нам усім, як заклік:

— Беражыце мір! Беражыце спакойны сон вашых дзяцей!

«ЛЮДЗІ ДОБРЫЯ, ПОМНІЦЕ...»

...Яны ехалі за сотні кіламетраў ад свайго дома ў далёкую краіну, каб ускласці сціплыя букецікі кветак на магілы тых, хто са зброяй у руках змагаўся і за іх жыццё, за ўсмешку на іх загарэлых пад мірным сонцам тварыках. Піянеры са Славакіі пакінулі свае запісы ў памятных кнігах многіх журботных музеяў Беларусі. Два тыдні ў розных кутках гэтага далёкага і ў той жа час вельмі блізкага нам краю можна было бачыць чырвоныя гальштукі славацкіх хлопчыкаў і дзяўчынак, іх шырока расплюшчаныя вочкі, іх дробныя далонькі, якімі яны гладзілі мармур, бронзу і камень помнікаў і абеліскаў.

— У вашай краіне жыве мой добры таварыш, — так пачаў гутарку са славацкімі дзецьмі ўдзельнік партызанскай барацьбы В. Раманоўскі. — Яго завуць Ладзіслаў Сташка.

— Мы яго ведаем! Ведаем! — хорам закрычалі дзеці ў адказ. — Мы пісалі яму пісьмо! І ён нам многа расказваў пра беларускіх партызан, пра баі з фашыстамі.

І так было ўсюды. Дзякуючы агульным сябрам, знаёмым імёнам, сумесна пралітай крыві бацькоў і дзядоў тут, на Беларусі, славацкіх дзяцей прымалі, як сваіх родных, і яны адразу ж адчувалі сябе, як дома.

Многа было цудоўных спатканняў і незабыўных уражанняў. Але адно запомнілася асабліва—на ўсё жыццё.

...За паўсотні кіламетраў ад сталіцы Беларусі прытулілася да лесу вёсачка. На досвітку з комінаў дваццаці шасці яе хатак віўся ў неба дым, са стукам адкідваліся веснічкі і чулася тупаценне дзіцячых ног—хлопчыкі і дзяўчаткі беглі да студняў па ваду. Тут чуўся звонкі смех дзяцей, вясёлае перакліканне дзяўчат, спевы юнакоў. Хатынь... Тут, у гэтым журботным, у гэтым свяшчэнным куточку Зямлі, мы ўсведамляем, якую страшэнную рану нанёс Беларусі фашызм, рану, якая не загаілася і да сённяшняга дня. І зноў мы ціха ступаем, схіліўшы галаву. І зноў вочы дзяцей шырока раскрыты ад жаху.

У цэнтры вёскі-могільніка гарыць Вечны агонь. Рукі славацкіх дзяцей ускладаюць да яго кветкі, маленькія далонькі ўскідваюцца над галовамі ў салюце.

Хвіліна цішыні. Усе навокал заміраюць у маўчанні, расчулена пазіраючы на дзіцячыя тварыкі, застылыя ў вялікім смутку.

Я акідваю позіркам мемарыял — ён просты, ён наўздзіў просты. Няма ў ім пампезнасці, не ззяе ён золатам і пышнасцю. Аднак адчуваецца вялікая сіла, якую творцы ўклалі ў найпрасцейшы матэрыял — суровы камень і бронзу. Мемарыял не навязваецца на знаёмства з вамі, ён вабіць да сябе, прымушае чалавека схіліць— аж да зямлі — галаву і задумацца. І выціскае слёзы з вачэй. «Людзі добрыя, помніце: мы любілі жыццё, і Радзіму нашу, і вас, дарагія. Мы згарэлі жывымі ў агні. Наша просьба да ўсіх: хай жальба і смутак абернуцца ў мужнасць і сілу, каб змаглі ўвекавечыць вы мір і спакой на Зямлі. Каб нідзе і ніколі ў віхры пажараў жыццё не ўмірала!»

Слова за словам чытаю я гэты зварот да жывых. Мы завучваем яго напамяць. Дзеці занатоўваюць словы ў свае запісныя кніжкі і дзённікі. Чыстыя слёзы акрапляюць зямлю. Зямлю, якая засталася мёртвай, каб жыццядайнай была ўся планета Зямля.

ВЫЗВАЛЕННЕ

Высокая, стройная дзяўчына з прыветлівай усмешкай на твары падносіць нам хлеб-соль. На яе просты ўбор з бялюткага палатна, аздоблены сіняй і чырвонай вышыўкай, падаюць цяжкія пляцёнкі светларусых косаў. Погляд вачэй, блакітных, як тутэйшыя засмужаныя далячыні, без слоў гаворыць нам:

— Мы вітаем вас!

Так на Беларусі ў сорак чацвёртым віталі свабоду, так і сёння вітаюць кожнага, хто прыходзіць да яе як сябар.

Тады такая ж, пэўна, светлавалосая дзяўчына са слязамі на вачах абдымала камандзіра танка, які першым уварваўся на вуліцы Мінска. «Гэты горад, — каркаў цекалі Гітлер,— я знішчу... Я загадаю ўзараць зямлю, на якой ён стаяў. Ад яго не застанецца нават успаміну...». Сёння гэтыя праклёны здаюцца мне голасам з даўняй-даўняй мінуўшчыны, з небыцця — я іду па шырокіх бульварах сталіцы Беларусі, слухаю шум фантанаў і спеў птушак у парках і скверах.

Мы заходзім у чатырохпавярховы будынак, напоўнены жалобнай цішынёй — Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Тысячы наведвальнікаў... Лаўлю сябе на думцы, што калі б ступені лесвіц былі не з мармуру, то пэўна, ужо даўно працерліся б...

У цэнтры плошчы Перамогі ўзвышаецца абеліск. Каля Вечнага агню з дня ў дзень свежыя букеты кветак — у памяць аб вялікай самаахвярнасці і мужнасці народа. Бо колькі ж людзей з тых, каго мы штодня сустракаем на вуліцах горада, не ведае, дзе магілы іх блізкіх!

Многа на зямлі Беларусі помнікаў, абеліскаў, мемарыяльных комплексаў — вялікіх і малых, грандыёзных і сціплых. Усе яны нагадваюць нам пра ахвяры і гераізм людзей краіны. Тут, у гэтым ціхім, маляўнічым краі, пачалася вайна. Тут пралёг крывавы рубеж Брэста. За ім іншыя рубяжы, палітыя крывёю, разбітыя бомбамі і снарадамі... Цяжкія баі легендарнай 100-й дывізіі генерала Русіянава пад Мінскам, рашучы контрудар на Бярэзіне, Магілёўская эпапея, абарона Гомеля...

Курган Славы... Ён нібы падпірае сабой высокі блакіт неба, яго відаць адусюль, яго абвяваюць вятры з усіх бакоў свету. З яго вяршыні вы бачыце шырокі абсяг вызваленага краю — далёкія ўзгоркі, пакрытыя цёмнай зелянінай лясоў, люстраную паверхню рэк, квітнеючыя палі і лугі, і сярод іх сярэбраную стужку — магістраль Мінск—Масква.

Мы з падзякай прынялі твой хлеб-соль, сінявокая, пяшчотная прыгажуня — Беларусь, прынялі так, як прымалі яго нашы бацькі і дзяды, калі станавіліся ў шарэнгі змагароў за тваю і нашу свабоду.

Пераклаў са славацкай А. МАЖЭЙКА.



V. ЗЯМЛЯ ДУБРОВЕНСКАЯ

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 26, 27).

Пасёлак Асінторф — другі па велічыні населены пункт у Дубровенскім раёне, таму пра яго варта расказаць асобна.

Узнікненне пасёлка звязана з асваеннем буйных тарфяных пакладаў Асінаўскіх балот. Першыя распрацоўкі пачаліся тут яшчэ ў 1918 годзе. Тады меркавалася выкарыстоўваць асінаўскі торф як паліва для прадпрыемстваў і паравозаў. Але ў 1919 годзе, калі сюды наблізіўся фронт, работы былі спынены.

У 1927 годзе ўрад Савецкай Беларусі прыняў пастанову аб будаўніцтве тут раённай электрастанцыі, паліва для якой павінны даць Асінаўскія балоты. Па тых часах гэта была вялікая будоўля. На дапамогу дубровенцам прыехалі рабочыя з многіх абласцей краіны. Тады ж быў і закладзены пасёлак Асінторф.

У гады Вялікай Айчыннай вайны, калі Дубровеншчыну акупіравалі нямецка-фашысцкія захопнікі, у Асінторфе актыўна дзейнічала камсамольска-маладзёжнае падполле. Касцяк яго склалі маладыя рабочыя торфапрадпрыемства і электрастанцыі. Напачатку іх было сорак пяць. Пазней да арганізацыі далучылася яшчэ некалькі дзесяткаў юных змагароў. Дыверсіі праводзіліся адна за другой. Калі ж восенню 1943 года фашыстам удалося натрапіць на след падполля і заставацца ў пасёлку стала небяспечна, моладзь пайшла ў лес, да партызан, з якімі ўвесь час падтрымлівалася цесная сувязь.

Пра змаганне асінторфаўскага падполля з фашыстамі падрабязна расказваецца ў мясцовым музеі. А непадалёку ад пасёлка, каля аўтамагістралі Масква-Мінск, высіцца помнік, узведзены ў 1966 годзе ў гонар маладых патрыётаў Асінторфа.

...Зараз на зямлі дубровенскай буйна каласіцца жыта, рассцілаюцца прасторныя палі з сінявокімі льнамі. Вачэй не адарваць — вельмі прыгожае відовішча. Нават не верыцца, што некалі гэтая зямля ўздоўж і ўпоперак была перарытая траншэямі і акопамі, узарана снарадамі...

Раны на целе зямлі, безумоўна, залячыць можна: засыпаць акопы, аднавіць разбураны дом, пабудаваць новы. Але раны на сэрцы... Як загаіць іх? Як суцішыць боль страты родных і блізкіх: 40-гадовага бацькі, які не вярнуўся з вайны і 5-гадовага брата, якога фашысты застрэлілі толькі за тое, што бацька ваюе на фронце? А 20 тысяч маладых салдат, што ляжаць у гэтай зямлі? Нялёгка трымаць такі цяжар на сэрцы. І няма лекаў, якія маглі б залячыць гэтыя раны.

НА ЗДЫМКАХ: помнік героям асінторфаўскага камсамольска-маладзёжнага падполля; у адной з залаў музея ў пасёлку Асінторф.

Фота С. КРЫЦКАГА.



THE SPIRIT OF BYELORUSSIA

Mike Davidow was born in 1913. His father was a photographer and his mother was a garment worker. While attending Brooklyn College he took an active part in the students' movement.

During World War II Mike Davidow served in the US Army and participated in military operations.

He is the author of several plays. One of them, «The Long Life», won him first prize in a nation-wide one-act play competition in 1964.

From 1961 to 1968, he was a writer on political subjects for the «Daily World»; he also worked as a correspondent for this newspaper in Moscow for some years.

The articles, that we publish, were written and sent to our newspaper by Mike DAVIDOW after his last visit to Byelorussia.

MARIA OSIPOVA

Maria Osipova is a gentle, soft-spoken elderly woman- a typical Russian babushka. And that she is indeed, she informs you with pride. «I have 11 grandchildren- six children». It was this gentle woman who together with her accomplice, Elena Mazanik, on Sept. 22, 1943 eliminated General Wilhelm von Kube, one of Hilter's most brutal gauleiters, then commendant of Minsk.

«We let the nazi monsters know: no one will escape the wrath of our people'». The gentle face became stern.

The plot was well organized and carried out. Nikolai Furtz, a driver who worked with the Germans, took them out of the city and placed then in contact with the partisans. They were flown to Moscow and in Nov, 1943 awarded, Hero of the Soviet Union.

«I was working as head of a history department. I had two children, a girl of almost 12 and a son of little more than 5. June 22, 1941 was a beautiful, sunny day. Life, after so many years of hard work was good. Then suddenly misfortune fell upon us».

Maria continued in a low voce. «I will never forget Molotov's speech at 11 A. M. the next day. 'Sisters and brothers our motherland is in danger', he said. Men and women rushed to volunteer. Minsk was being bombarded».

Osipova paused. «Of course, at first I was afraid. Then I thought: if I am afraid and our soldiers are afraid, who will defend our motherland? Who will stop the fascists?»

One of the most dangerous activities carried out by the party underground groups was to help save as many of the Jews as possible.

Osipova recalled: «On July 5 the nazis formed a Jewish ghetto in Minsk. Any one caught bringing food, clothing to Jews in the ghetto would not only be shot but the entire family killed. But, we Soviet people were not afraid of such edicts».

Leaflets distributed by the underground were also directed toward the German soldiers. Elena who knew German well translated them «Four German soldiers came over us.» noted Osipova.

«One of them Fritz Schmenkel was caught by the nazis and brutally tortured to death. He was posthumously awarded Hero of the Soviet Union».

After the war, Maria Osipova was for many years a member of the Supreme Court of Byelorussia. She served as deputy of the Supreme Soviet of Byelorussia and was elected to its presidium. And now?

«NOW?» she repated. «Now, can anyone stand by and just look on? We have a wonderful life. For 40 years we have lived in peace. How happy our life can be'. But, your Reagan threatens us, the world and yes, your Americans too, with a war even more terrible than the one we suffered through'».

She was silent for a moment.

«I want to particularly appeal to your American mothers, yes and grandmothers like me, too. We bring life into this world and we must permit no one to take it away. No one'».

THE REBIRTH OF AN ANCIENT TOWN

Volkovisk like all of Byelorussia was in the eye of the nazi storm. There is this one distinction. This ancient small town established in 1252 and just 22 miles from the Polish border is linked with my personal history. It is my birthplace and my father's and his father's before him. I stood before the memorial to its martyred dead near a ravine where the nazis had slaughtered 9,238 people of the town and district. I have paused in tribute to so many memorials in all 15 Soviet republics. This time it was perhaps closer to home.

Among the 9,238 were our relatives, friends, people who had once held me in their arms. It could have included by own family.

I have no personal memory of Volkovisk- I was only 4 when my mother and my sisters and came to the U. S. to join my father in the wake of World War 1.

Now I had come to my birthplace on the eve of celebration of the 40th anniversary of the victory over fascism. Before me, gathered in Volkovisk's City Hall (City Soviet), were a group of partisans and underground fighters who were among those who made that victory possible.

Today like the legendary Phoenix, Volkovisk had risen from its ashes. Today it is a town of 34,000 (A 7000 increase since I last visited it in 1979). A new «city» of 10,000 apartments (under construction 6 years ago) was now before me. And besides it work had already been started upon another new micro-area.

But the new addition around which deputy Mayor Timofei Bezhosik, a young, vigorous man, proudly escorted me, was the Auto Park built four years ago. The visit was particularly made memorable by its director, Ivan Bochko. Tall and extremely powerfully built, Bochko had the gentlest of faces. Born in a village 40 kilometers from Volkovisk, he was 6 years old when the nazis occupied the area. «But, do you know, those childhood years of suffering are more vivid to me that what happened yesterday» he said. «I am glad to welcome you as an American who wants to bring the truth of our life to your people. Let your Americans look into our hearts. They will only find peace there». Then Bochko proceeded to take me on what was more of a nature trip than a tour through an auto park.

Not that it lacked any of the modern equipment and facilities. A force of 560 drivers and service personel mechanics (200 of whom are women) provide efficient transportation to the city and district. Starting with the entrance, each floor and section of the large auto park had its miniature garden, wild life, fauna and flora. It was a virtual botanical garden! There were 56 different type of trees and plants, three large hothouses, one just for flowers, 25 bee hives (another 25 under construction) (4 tons of cukes were produced for the workers last year). There were 150 newly planted apple trees. On the walls of the buildings were murals depicting belorus folklore. Bochko noted the look of surprise on my face. «Where do we workers spend most of our lives? At our work places'. Where then more than where we work should there be beauty?» This then was the Volkovisk these partisans before me had defended and made possible. Yevdokim Petukhov, a tall, sturdy man with white hair and a ruddy complexion was born in Tomsk, Siberia. How did he get to Volkovisk? «I was sent to work behind German lines. We came here to organize partisan activity. We organized Komsomol and even Pioneer underground. July 14, 1944 we met the Red Army when Volkovisk was liberated. I fouht for every bit of soil here. You get attached to a place that plays such an important role in your life. I've been here 42 years. I visit my Tomsk eittle more often than you visit your Volkovisk. The young birch tree I planted there is now old.

Yakov Flaks, also fought as a partisan around Volkovisk.

«Let me tell you the story of 9 Jewish doctors of Volkovisk I want you to remember their names'.» he said with some emotion.

A nazi car was blown up not far from nearby Castle forest. The nazis investigated and found a wounded partisan, Feodorov. They discovered he was operated on and began to look for the doctor. They summoned the nine Jewish doctors to gestapo headquarters. 'You have three days to name the one who helped this partisan' they were told. And for three days they were without food or water. Again they were asked to name names. All were silent. Again they were deprived of food and water for 3 days. This time- one doctor stepped forward- Weinberger. 'I am the one who helper the parisan» he said. But no sooner did he confess than all the other 8 stepped forward. All were executed». .

This is the story statistics no matter how grim can never tell. This is the story of my Volkovisk and thousands of Volkovisks all over this vast land of socialism.

I heard the shrill voices of children at play as I left. The kind of sound that only comes with peace. And I thought of husky, hearty Bochko, the passionate lover of nature who was denied his childhood. May the Volkovisks the world over enjoy the peace they so richly deserve'.

On photo: Centre of Volkovisk.

THE HANDWRITING ON THE WALL

STALINGRAD WAS the turning point of the war against fascism. BREST was the hand writing on the wall. Here, in the first grim hours of the most savage attack in military history, the Soviet people revealed the unconquerable spirit that was to seal Hitlers's doom. The charred clock in the battle-scarred fortress built in 1830 stopped at 4A. M. That was the hour on June 22, 1941 that the nazi forces with 3—5 times military superiority struck the Brest military garrison of 4000 (another 4.000 with most of the commanders were away on manouvers. The garrison newspaper for that day (set up but never off the press) reveals how unexpected was the sudden attack. Sports and local news were featured.

I heard from the lips of Timofei Dombrovsky, one of the few survivors of the garrison force what happened on that fateful day. Still limping badly from his severe wounds, his hair snowy white, Dombrovsky recalled' «It was a typical Saturday on the eve of the attack. We were watching a film. We talked a bit then went to bed. I was awakened by thundering blasts. At first, we did not realize we were under attack. It was only at day break that we understood we were surrounded. We were completely cut off not only the rest of the Soviet Union but the world. Communications were severed. We were completely encircled. We heard nothing- neither Molotov's speech or Stalin's. All we knew: we had to hold out». He paused as he stared at the blackened,redbricked walls of the remains of the fortress.

«We had very little food and water. Nazi bombardment destroyed most of our food supplies in the very first hours. And the little Mukhavets River that flows into the Bug, which divides Byelorussia from Poland was under constant fierce artillery attack». The fight for water was a fight not only for life but for the defense of Brest. A defender of Brest carved out of rock and as if rising from the ground, one hand gripping a Kalashnikov rifle seems to be rushing toward the river. The monument is called THIRST.

Dombrovsky was badly wounded and taken prisoner. The fortress was taken after a month's unprecedented resistance. In 1944, Dombrovsky escaped from a nazi prison camp and joined up with the Soviet forces liberating Poland.

«I came back here on Victory Day. And I wept. I felt such joy and such sorrow». Only 400 of the 4000 (mostly prisoners) survived and many of them died shortly after from their wounds and sadistic abuse in nazi prison camps.

General Guderian who commanded the nazi tank forces at Brest and the German general staff expected to take the fortress in 8 hours. Their own diary notes reveal how astonished and disturbed they were by the struggle-to -the death resistance they met.

There was no front in the Battle of Brest. Each group of Soviet soldiers fought to the last. On the charred, wounded walls of their «front» they scrawled their last words of defiance: «NOW WE'VE DONE ALL WE COULD. WE WILL DIE BUT WE WILL NOT LEAVE THE FORTRESS». Another, painfully written message declared: «WE ARE DYING WITHOUT SHAME».

There were 300 women and children in the Fortress. In an effort to save their lives, the commander of the fortress surrendeed then under a white flag. Many of them however, were killed by the nazis. Not a single defender of Brest voluntarily surrended. Brest was an all-Soviet defense- more than 32 nationalities were represented among its heroes and heroines.

The iron bars along the battered walls of the fortress are draped with the red scarfs of Young Pioneers from every part of the USSR. «You died for our happy childhood» many of them read. Together with Dombrovsky, the survivor of Brest, were gathered a number of its liberators. Lev Varchenko was in the entire siege of Leningrad, Sumbat Arzummanyan was a commander of a partisan brigade that fought in and around Brest, Anton Butraminko who lost nine members of his family, fought in the Battles of Moskow and Kursk before liberating Brest, Vladimir Vlasov, a well-known boxing coach was in the Battle of Stalingrad and broke out of nazi encirclement nine times. He was seriously wounded in Berlin and was three times awarded the Cavalier medal, Ivan Svintak was with the 12th Guard Paratroopers in Stalingrad, broke out of encirclement 13 times before liberating Brest. He fought in the Battle of Berlin and the liberation of Prague.

There was a long silence after I had listened to what amounted to a history of the war against fascism. Butraminko broke the silence. «Tell me, is it true that many Americans think we want to attack them?» he asked. I told him that is what they are told day in day out by our anti-Soviet press and our nuclear barbarians in Washington.

Butraminko shook his head incredulously.

«But how could they believe that? Do they know what it means to lose nine members in your family? Do they really think that after what we have gone through we want to go through even a worse hell? Do they really believe these terrible lies about us?»

СВЯТА ПАЭЗІІ Ў РАКУЦЁЎШЧЫНЕ

БРУІЦЬ МАКСІМАВА КРЫНІЦА

У вершы, які Максім Багдановіч прысвяціў Дзіядору Дзябольскаму, свайму сябру па Яраслаўскай гімназіі, ёсць такія радкі:

Быць можа я не скончу жыць,
Бо ў ім няма канцоў,
Зноў шлях знаёмы пабяжыць,
І ўсё, што мозг здалеў забыць,
Перажыву я зноў.

Гэтыя радкі прыгадаліся ясным сонечным ранкам на шляху да вёскі Ракуцёўшчына, што на Маладзечаншчыне, куды з усяго наваколля ехалі і ішлі людзі, каб ушанаваць памяць свайго слыннага паэта, пакланіцца зямлі, якая дала моц яго крылам, пачуць яго вершы.

Максім Багдановіч пражыў у Ракуцёўшчыне два летнія месяцы 1911 года. Як Болдзіна для Пушкіна, вёска гэта стала тым месцам, дзе творчы геній паэта выявіў сябе з максімальнай сілай. За кароткі час тут было створана 17 вершаў і 2 паэмы. Але калі для рускага паэта Болдзіна было месцам вымушанага прытулку, то сюды, на Беларусь, Багдановіч імкнуўся ўсё сваё свядомае жыццё. (Памятаеце: «У родным краю ёсць крыніца жывой вады. Там толькі я змагу пазбыцца сваёй нуды»). Страціўшы ў пяцігадовым узросце маці, будучы паэт адначасова развітаўся і са сваёй Радзімай. Жыў з бацькам у Ніжнім Ноўгарадзе, Яраслаўлі. А Беларусь назаўжды засталася ў яго свядомасці незагойнай ранай, самым балючым і самым дарагім жыццёвым успамінам. Вобраз той, хто даў яму жыццё, і вобраз Бацькаўшчыны непарыўна зліліся ў адзіны сімвал Маці-Радзімы, пад якім, па сутнасці, і прайшла ўся творчасць паэта.

Прыезд Багдановіча ў Ракуцёўшчыну стаў першым у сталым узросце спатканнем паэта з Беларуссю. Акружаная з усіх бакоў глухімі старымі барамі, забытая, здавалася б, самім богам, гэта вёска зрабілася для Багдановіча сімвалам Радзімы. Гаючым тут было ўсё: і беларуская мова, і лад жыцця, размераны і просты, і сцюдзёная крынічная вада, і ўсмешка маладой гаспадаровай пляменніцы, якая прыехала пагасціць сюды са сваёй маленькай дачкой на тыдзень-другі. Таму тут так вольна і глыбока дыхалася паэту, многа і лёгка пісалася.

Сіла часу няўмольная. Згубіўся ў народзе след гаспадароў, у якіх жыў Максім Багдановіч. Не збераглася іх хата. Значна змяніўся выгляд самой вёскі.

Але бруіць, струменіцца Максімава крыніца. П'юць яшчэ сокі зямлі ТЫЯ клёны. Вакол мемарыяльнага знака, пастаўленага ў Ракуцёўшчыне ў 1977 годзе, набіраецца моцы Максімаў сад, за якім старанна даглядаюць вучні Чысценскай сярэдняй школы.

Традыцыйнымі ў Ракуцёўшчыне становяцца святы паэзіі, прысвечаныя памяці Максіма Багдановіча. Іх натхніцелем і галоўным арганізатарам з'яўляецца заслужаны дзеяч культуры БССР, вядомы краязнаўца Вячаслаў Ляшковіч. Яго ж найпершыя памочнікі і дарадцы ў гэтай справе — супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску.

Сёлета на свята паэзіі прыехалі і прыйшлі людзі не толькі з навакольных вёсак, але і з Мінска, Маладзечна, Гродна, Гомеля, Полацка, Вілейкі, Стоўбцаў, Валожына, Вільнюса, Каўнаса. На свяце панавала шчырая і непасрэдная атмасфера, калі хацелася спяваць разам з хорам, гаварыць вершамі. Урэшце, так і было, калі меркаваць па некаторых экспромтах.

Палымяна гаварыў у той дзень пра паэта гісторык Мікола Ермаловіч. Чыталі свае вершы і згадвалі пра Багдановіча паэты Максім Лужанін, Станіслаў Шушкевіч, Анатоль Вярцінскі, Данута Бічэль-Загнетава, Уладзімір Мазго. Іх словы змяняліся словамі самога Максіма, якія гучалі ў выкананні нашчадкаў тых, каго, магчыма, сустракаў паэт у Ракуцёўшчыне і яе ваколіцах шмат год назад.

Поўнымі гаспадарамі на свяце былі калектывы мастацкай самадзейнасці з Маладзечанскага раёна і Вілейскага завода «Зеніт». Ім дасталіся найбольш гарачыя апладысменты гледачоў. Гучалі на свяце таксама класічныя творы, якія выканалі навучэнцы і выкладчыкі музычных устаноў Маладзечна.

«Старонкай лепшай у штодзённіку жыцця» назваў Максім Багдановіч два месяцы свайго жыцця ў Ракуцёўшчыне. Добрай памяццю нашчадкаў адзначаны яны сёння.

Тамара КАРОТКАЯ.

НА ЗДЫМКУ: на свяце паэзіі выступіў адзін са старэйшых беларускіх пісьменнікаў Максім ЛУЖАНІН.

Фота А. КРЫШТАПОВІЧА.

ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН У ГДР

Народны харэаграфічны ансамбль «Зорка» і вакальны ансамбль «Купалінка» Палаца культуры тэкстыльшчыкаў горада Мінска вярнуліся з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі з узнагародамі. Яны ўдастоены ганаровага звання «Народны калектыў ГДР».

Дзесяць дзён знаходзіліся беларускія самадзейныя артысты ў нямецкіх сяброў, дзе прымалі ўдзел у канцэртах, што праходзілі ў рамках Дзён культуры СССР у ГДР.

ТРЫЦЦАЦЬ ГОД НАЗАД КАРЛАС ШЭРМАН СТАЎ ГРАМАДЗЯНІНАМ СССР

...АЗЁР ТВАІХ ЦАЛУЮ НЯБЁСЫ

...Нэўкенскія яблыкі сакавітыя, чырванашчокія і такія смачныя, аж пашчэнкі круціць ад аднаго іх выгляду. І маленькі Карлас не разумее, чаму там, вельмі далёка, у невядомай яму краіне нейкія антонаўкі для бацькі смачнейшыя. Паслухаць яго, дык у тым краі і рыба без касцей... лінь. «А музыка якая ў гэтым слове, прыслухайся, сынку, — закрыўшы вочы, гаворыць бацька,— лін-н-нь». А называецца той край Бацькаўшчына — Беларусь. Адтуль нястача, голад, хваробы пагналі Рыгора Шэрмана за акіян шукаць лепшай долі. Нямала давялося пакалясіць па свету: Уругвай (там нарадзіўся Карлас), потым Аргенціна.

Мусіць, сапраўды была незвычайная тая Беларусь, бо аб ёй толькі і гаварылі ў сям'і. «Фанатыка», — мякка дакарала бацьку маці, а ён адно сумна трос галавою ў адказ, мармычучы нешта пабеларуску. Аніяк не мог да іспанскай мовы прызвычаіцца. Добра было б, каб толькі да мовы... У Амерыцы сніў сябе то ў чоўне на Прыпяці, то касцом на лузе ў вэлюме рачнога туману. Ды што там гаварыць: у чужой старонцы не так і сонца свеціць.

Адразу пасля атрымання дазволу ў 1954 годзе бацька вярнуўся на радзіму ў Пінск. Далі дзяржаўную кватэру, стаў працаваць на мэблевай фабрыцы. Калі выходзіў на пенсію, атрымаў пачэснае ў Савецкай краіне званне ветэрана працы.

Ва ўспамінах маленства Карласа Шэрмана навечна адбіліся жывыя карціны: калоны дэманстрантаў, агонь у пустых трамвайных вагонах, уругвайскія добраахвотнікі з кумачовым лозунгам: «Няхай жыве рэспубліканская Іспанія».

Юнацтва патрабавала адказнасці. І перш за ўсё за свой уласны лёс. Карлас вучыцца ў Нацыянальным інстытуце імя М. Марэна па спецыяльнасці філалогія. Піша вершы, робіць пераклады. На першыя літаратурныя крокі юнака звярнуў увагу пісьменнік-камуніст, лаўрэат Ленінскай прэміі за ўмацаванне міру паміж народамі Альфрэда Варэла. Малады журналіст друкуе інтэрв'ю з Іллёй Эрэнбургам і Пабла Нэрудам. Удзельнічаў Карлас Шэрман і ў маладзёжным антываенным руху, у рабоце культурна-спартыўнага клуба суайчыннікаў імя Бялінскага. (Да гэтага дня захоўвае членскі білет клуба). Але ўсё часцей і часцей думаў ён пра зямлю бацькоў. Нарэшце, у 1956 годзе дваццацігадовы Карлас стаў грамадзянінам Савецкага Саюза. Пазней паэт напіша ў вершы пра незабыўнае імгненне сустрэчы з бацькоўскай зямлёй:

І з гадзінамі, што
расталі ў ценях
З акіянам, што як
бадзяга босы
Беларусь-пакутніца,
на каленях
Я азёр тваіх цалую нябёсы.

— Адразу ўладкаваўся на працу ў Акадэміі навук, — гаворыць Карлас Рыгоравіч. — Прапанавалі мне пасаду загадчыка рэдакцыйна-выдавецкага сектара фундаментальнай бібліятэкі імя Якуба Коласа. А вольныя часіны цалкам прысвячаў творчасці.

Карлас Шэрман вызначае сваю галоўную творчую спецыяльнасць так: паэт-перакладчык іспанамоўнай, рускай і беларускай літаратур.

— Мастацкі пераклад служыць мостам дружбы паміж народамі і іх культурамі, мостам разумення. Апошняе асабліва важна сёння.

Мовай мастацтва паэт дапамагае людзям зразумець рэчаіснасць, зразумець, хто ёсць хто. Чаму я гавару так? Таму, што ў тым жа Буэнас-Айрэсе просты чалавек няшмат ведае аб радзіме Леніна. У грамадстве, дзе адзіны інтарэс — долар, абывацель нямнога чытае, мала чым цікавіцца, апроч падаткаў, цэн і пошукаў працы.

Пісьменніцкі дэбют Карласа Шэрмана — пераклад на рускую мову рамана М. Сапата Алівелы «Чорны загон» — адбыўся ў 1967 годзе ў рэспубліканскім часопісе «Неман». Да гэтага ён ужо, праўда, звяртаўся да творчасці Блока, Лермантава, Пушкіна, кубінскага празаіка Ф. Піты Радрыгеса. Але пераломнай і вызначальнай была сярэдзіна сямідзесятых гадоў, калі выйшлі асобнымі выданнямі ў перакладзе на іспанскую мову апавяданні В. Хомчанкі, народныя казкі для дзяцей у апрацоўцы А. Якімовіча, аповесці В. Быкава, І. Шамякіна, творы А. Куляшова, М. Танка, выбранае Купалы і Коласа.

— А якім прынцыпам у адборы матэрыялу для перакладу з іспанскай на беларускую мову вы карыстаецеся?

— Адбіраю ўсё лепшае. Па магчымасці — сучаснае. Абавязкова праўдзівае. Ёсць такі тэрмін — «рытміка пачуцця», або «рытмічная праўда». Мы вучымся гэтаму ў Янкі

прэм'еры, выстаўкі, сустрэчы

XIV МІЖНАРОДНЫ КІНАФЕСТЫВАЛЬ

У Маскве праходзіць XIV Міжнародны кінафестываль, у якім прымаюць удзел больш чым сто краін. Тры журы гэтага прадстаўнічага конкурсу ўзначальваюць вядомыя савецкія кінарэжысёры С. Герасімаў, А. Згурыдзі і пісьменнік А. Алексін.

У конкурсе поўнаметражных мастацкіх фільмаў Савецкі Саюз прадставіў карціну рэжысёра Э. Клімава і беларускага пісьменніка А. Адамовіча «Ідзі і глядзі», якая расказвае пра гады акупацыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

ШАСЦІСОТАЯ КНІГА «ЮНАЦТВА»

Выпушчана шасцісотая кніга за гады работы выдавецтва «Юнацтва». Юбілейнай кнігай, тыраж якой 250 тысяч экземпляраў, стаў зборнік «Дзецям пра У. І. Леніна». Сярод аўтараў Надзея Крупская, Уладзімір Бонч-Бруевіч, Міхаіл Зошчанка...

Усяго ў выдавецтве «Юнацтва» выпушчана каля 50 мільёнаў экземпляраў кніг мастацкай і іншай літаратуры.

ГАСТРОЛІ ТЭАТРА

Спектаклем «Верачка» па п'есе А. Макаёнка ў Вялікараёўскім сельскім Доме культуры пачаў свае гастролі ў Капыльскім раёне калектыў тэатра імя Янкі Купалы.

Сустрэчы купалаўцаў з аматарамі тэатральнага мастацтва Капыльшчыны — працяг добрай традыцыі. Калісьці ў Капылі неаднаразова бываў і выступаў перад яго жыхарамі сам Янка Купала.

НА МОВЕ ДРУЖБЫ

«Ваенная літаратура і праблемы мастацкага перакладу» — тэма пасяджэння савецкіх і балгарскіх перакладчыкаў, якое адбылося ў Мінску. У сустрэчы прыняла ўдзел дэлегацыя Саюза перакладчыкаў Балгарыі. У яе складзе былі вядомыя перакладчыкі і даследчыкі савецкай літаратуры Сімеон Уладзіміраў, Піліп Гінеў, Найдзен Вылчаў, Наташа Манолава, Каця Вітанава, Уладзімір Гінеў.

Госці адзначалі, што ў Балгарыі любяць і ведаюць беларускую літаратуру. Сярод самых апошніх навінак, што перакладзены ў братняй краіне,— «Карнікі» А. Адамовіча, «Золак, убачаны здалёк» Я. Брыля, «Паляванне на Апошняга Жураўля» А. Жука, «У вайны не жаночы твар» С. Алексіевіч і іншыя.

Вялікую маладзёжную аўдыторыю сабраў у зале Белдзяржфілармоніі аўтарскі канцэрт народнага артыста БССР кампазітара Ігара Лучанка, чые песні любяць выканаўцы і шырокая публіка. Многія з іх гучалі на сусветных фестывалях у Берліне і Гаване. А аўтар прыязджаў адтуль лаўрэатам.

У праграме прагучалі ўжо вядомыя і новыя творы кампазітара. Увесь збор ад канцэрта будзе пералічаны ў фонд XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве, ганаровым госцем на які запрошаны беларускі кампазітар.

НА ЗДЫМКУ: Ігар ЛУЧАНОК у час канцэрта.

Фота В. АЛЯШКЕВІЧА.

Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. Інакш кажучы, тое, што напісана, павінна адпавядаць таму, што адчуваеш. Самы нязначны фальш у пачуццях прыводзіць да няшчырасці.

На заранку маладосці ў Доме аргенцінскай культуры Буэнас-Айрэса я пазнаёміўся з Уга Дзітаранта. Прайшло трыццаць гадоў. Не так даўно трапляе мне ў рукі яго кніжка «Працэсы». Не перакласці яе я не меў права, бо яна па сутнасці — кантрольная па гуманізму. Аргенцінскі паэт нагадвае, што лепшыя сыны і дочкі чалавецтва ахвяравалі сваім жыццём дзеля праўды існавання высокай ідэі. Пераклад «Працэсаў» надрукаваў наш беларускі штогоднік «Далягляды».

У буржуазных краінах, дзе газеты, часопісы, выдавецтвы — прыватная ўласнасць, друкуецца тое, што захоча гаспадар, а не тое, што патрэбна чытачу, прагрэсіўнай грамадскасці. Я гэта добра адчуў ва ўласнай рабоце да майго прыезду ў Савецкі Саюз. Пабла Нэруда стаяў на каленях і маліў выдаўца, каб той выдаў яго першую кніжку. Нават адмаўляўся ад ганарару. У нас усё інакш. Для пачынаючых літаратараў у выдавецтвах ёсць цэлыя серыі: «Першая кніжка паэта», «Першая кніжка празаіка». Калі неабходна, Літаратурны фонд дапаможа пісьменніку матэрыяльна. Напачатку для мяне ўсё гэта было вельмі дзіўным.

Памятаю, у 1954-м Нэруда прыехаў у Буэнас-Айрэс. Вялікі паэт прасіў дапамогі, падтрымкі: шахцёры чылійскага горада Лота пакутавалі ад невыносных умоў працы. Штольні выходзілі пад мора, здараліся частыя абвалы, іх залівала вада. Я прысутнічаў на прэс-канферэнцыі Нэруды і потым змясціў у левай прэсе справаздачу аб ёй. Пасля гэтага «свабодная» буржуазная прэса альбо заходзілася ад крыку, маўляў, «камуністычная прапаганда», альбо надрукавала... збольшага, выкінуўшы асноўнае.

Працягам гэтай тэмы стала наша размова аб перакладзе на рускую мову Карласам Шэрманам у сааўтарстве з В. Тарасам рамана вядомага калумбійскага пісьменніка Габрыэля Гарсія Маркеса «Восень патрыярха». Пераклад быў надрукаваны не толькі ў Беларусі, але і ў Маскве, Кішынёве.

— Раман Маркеса складаны, востры, — лічыць аўтар перакладу. — У некаторых краінах ён нават забаронены. Але я, працуючы над ім, ніколі не адчуваў ніякага ўшчамлення, прадузятасці, хоць не ўсё ў нас ішло гладка, асабліва ў сэнсе «тэхналогіі» перакладу.

Нашай задачай было паказаць чытачу ўвесь каларыт, своеасаблівасць стылю пісьменніка і абавязкова захаваць у першапачатковым выглядзе ўсе яго думкі. У другім выданні мы перадалі нават пунктуацыю пісьменніка. І гэта ў той час, як у Аргенціне і Уругваі распаўсюджаны так званыя «скарочаныя варыянты». Я бачыў і чытаў пераклад на іспанскую мову «Вайны і міру» Льва Талстога брашурнага тыпу...

Хутка споўніцца трыццаць год, як Карлас Шэрман жыве і працуе ў Беларусі. Ён шмат друкуецца ў рэспубліканскіх і цэнтральных перыядычных выданнях. Яго творы выпушчаны рознымі выдавецтвамі. Тут у яго добрыя і верныя сябры, такія, напрыклад, як паэт Рыгор Барадулін.

— Няма ў мяне ніводнага радка, які б застаўся без ацэнкі Рыгора Іванавіча. А «пазнаёміў» нас Гарсія Лорка. Рыгор Барадулін даўно марыў перакласці яго. Вось мы разам і ўзяліся за справу. Паэзія Барадуліна сугучна творчаму почырку іспанскага паэта: тое ж віртуознае валоданне словам, каласальнае адчуванне метафары. Таксама зрабілі пераклад лірыкі кубінскага паэта Нікаласа Гільена, чылійскай паэтэсы лаўрэата Нобелеўскай прэміі Габрыэлы Містраль і яе праслаўленага вучня Пабла Нэруды.

Рыгор Барадулін у 1984 годзе зрабіў пераклад з іспанскай мовы на беларускую паэмы К. Шэрмана «Дождж у Каралішчавічах». Дарэчы, у тым жа годзе Карлас Рыгоравіч святкаваў юбілей, пяцідзесяцігоддзе.

— У паэме, напэўна, падводзіцца пэўны вынік зробленага вамі за гэтыя гады?

— Так, у паэме прысутнічаюць біяграфічныя рысы. Але галоўная тэма — гэта пагроза карычневай чумы. Дрэва фашызму згарэла ў полымі 45-га, але, на жаль, засталіся парасткі. І не без удзелу некаторых дбайных «садоўнікаў»... Прэзідэнт Злучаных Штатаў наведвае могілкі эсэсаўцаў, тых, хто страляў у яго суайчыннікаў. У ФРГ точыць дзюбу чорнае арляня неафашызму. У паэме я гавару пра свечку, «тую, што целам была старога», пра «пяшчотныя абажуры з вышытай чалавечай скуры». Гэтыя «экспанаты» я бачыў на свае вочы. Барацьба не скончылася, і паэт не мае права стаяць у баку.

А на пісьмовым стале Карласа Шэрмана зборнік вершаў «Сны». Ён будзе двухмоўным, як і паэма «Дождж у Каралішчавічах», на беларускай і іспанскай мовах. Таксама хутка выйдзе ў перакладзе Карласа Шэрмана на мову Сервантэса зборнік лірыкі Р. Барадуліна «Чорны вол маёй трывогі», раман І. Чыгранава «Плач перапёлкі», у наступным годзе кніжка выбранай лірыкі М. Танка і анталогія беларускай паэзіі (40 імёнаў), якая ўбачыць свет у Гаване. Дапісваюцца апошнія радкі кнігі пра Кубу, дзе Карлас Рыгоравіч нядаўна пабываў у якасці прадстаўніка Саюза пісьменнікаў СССР на міжнародным форуме па кубінскай прозе.

Як бачым, шмат зроблена, але задум яшчэ больш. Упэўнены, усе творы паэта і перакладчыка Карласа Шэрмана знойдуць свайго чытача, бо кожны мост, які ён будуе, праходзіць праз ягонае сэрца.

Канстанцін ШАЛЯСТОВІЧ.

НА МІЖНАРОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ



Драматычны калектыў Маладзечанскага гарадскога Дома культуры прыме ўдзел у Міжнародным фестывалі аматараў тэатральнага мастацтва, які адбудзецца сёлета ў жніўні ў Чэхаславакіі. Ён пакажа спектакль па п'есе А. Дударава «Радавыя». На Усесаюзным аглядзе самадзейнай мастацкай творчасці народны тэатр узнагароджаны за гэтую пастаноўку дыпломам лаўрэата і вялікім залатым медалём.

НА ЗДЫМКАХ: артысты Маладзечанскага народнага тэатра — рабочыя, служачыя, выкладчыкі, навучэнцы; сцэна са спектакля «Радавыя».

Фота У. МЯЖЭВІЧА.

ЯК РЭАЛІЗУЕЦЦА ПРЫНЦЫП ПАРТЫЙНАСЦІ Ў САВЕЦКІМ МАСТАЦТВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

ПА ЎКАЗЦЫ СВАЙГО СЭРЦА

«САМАЕ моцнае ўражанне зрабіла на мяне тое, што палітычнае кіраўніцтва краіны ўдзяляе літаратуры такую вялікую ўвагу, надае ёй такое важнае значэнне. Народ і кіраўнікі партыі вельмі зацікаўлены ў развіцці літаратуры. Значыць, ваша савецкая літаратура з'яўляецца сапраўднай сілай у грамадстве».

Такую заяву зрабіў Прэзідэнт міжнароднай асацыяцыі крытыкаў Рабер Андрэ, які наведаў нашу краіну летась. Само гэта выказванне сведчыць аб разуменні заходнім літаратуразнаўцам сапраўднага характару ўзаемаадносін паміж КПСС і мастацтвам, паміж партыяй і творчай інтэлігенцыяй.

Звычайна заходніх саветолагаў шакіруе нават само спалучэнне слоў «партыйнасць літаратуры», «партыйнасць мастацтва». Пад партыйнасцю яны разумеюць дыктат партыйных функцыянераў над пісьменнікамі, мастакамі, кампазітарамі. Узаемаадносіны паміж КПСС і мастацкай інтэлігенцыяй прадстаўляюць як пазбаўленне апошняй свабоды творчасці і творчага пошуку.

Аднак сёння 1985 год. І заходняга гледача, чытача ўжо не задавальняе падобная трактоўка. Ён ужо ведае не толькі аб Вялікім тэатры, але і аб поспехах усяго шматнацыянальнага мастацтва, аб савецкім балеце, музыцы, кінафільмах. Ён бачыць на выстаўках творы савецкіх мастакоў. Чытае кнігі Шолахава, Твардоўскага, Ляонава, Быкава, Айтматава, Катаева, Шукшына. Ён разумее, што гэта — сапраўднае мастацтва, сапраўдная мастацкая творчасць. А творчасць вынікам дыктату быць не можа.

Прынцып партыйнасці мастацтва сапраўды існуе. Ён быў сфармуляваны У. І. Леніным у 1905—1907 гады ў артыкуле «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура». Ленін указваў, што ў грамадстве, заснаваным на ўладзе грошай, не можа быць рэальнай і сапраўднай свабоды. «Жыць у грамадстве, — падкрэслівалася ў гэтым артыкуле, — і быць свабодным ад грамадства нельга. Свабода буржуазнага пісьменніка, мастака, актрысы ёсць толькі замаскіраваная (ці крывадушна маскіруемая) залежнасць ад грашовага мяшка, ад подкупу, ад утрымання».

Выкрываючы міф аб пазакласавасці літаратуры і мастацтва, Ленін адкрыта, прама заяўляў, што ў сацыялістычным грамадстве літаратура будзе служыць не «верхнім дзесяці тысячам», а мільёнам і дзесяткам мільёнаў працоўных.

Прынцып партыйнасці мастацтва Ленін звязваў з правядзеннем палітычнай лініі партыі, што прадугледжвала не толькі аб'ектыўнасць і праўдзівасць, але і адданасць ідэалам сацыялізму — **добраахвотнае** служэнне ім.

Крытэрый партыйнасці, указваў Ленін, не супярэчыць спецыфічным законам мастацкай творчасці. Ідэі ў мастацтве не могуць існаваць па-за вобразнай асновай твораў, яны не могуць звужацца да кола практычных партыйных задач.

Сацыялістычную рэвалюцыю 1917 года руская інтэлігенцыя ўспрыняла па-рознаму. Лепшая яе частка, у тым ліку Горкі, Блок, Брусаў, Маякоўскі з першых жа дзён стала супрацоўнічаць з Савецкай уладай. Другая частка мастацкай інтэлігенцыі, якая раней выступала супраць царызму, яшчэ вагалася і чакала. Пэўныя слаі інтэлігенцыі рэвалюцыю не прынялі, выступілі супраць яе, абараняючы класавыя інтарэсы буржуазіі.

Партыя цярпліва памагала майстрам культуры (выключаючы непрымірымых ворагаў рэвалюцыі) зжыць памылкі і заняць правільную пазіцыю, вызначыць свае адносіны да перамогшага народа, аб'ектыўна адлюстраваць падзеі ў сваёй творчасці.

Культурнае жыццё краіны першых год Савецкай улады вызначалася выключнай складанасцю. Існавалі дзесяткі літаратурных асацыяцый і аб'яднанняў, якія прэтэндавалі на першынство і лідэрства, на выключнае права называцца «пралетарскімі». Адны з іх поўнасцю адмаўлялі дасягненні мінулага мастацтва, іншыя пад выглядам пралетарскай культуры спрабавалі навязаць маладым літаратарам уласныя паўбуржуазныя сістэмы. Адны выказвалі істотныя ідэйна-эстэтычныя тэндэнцыі часу і таму мелі пэўную ўстойлівасць і сілу. Другія ўзнікалі выпадкова і на кароткі тэрмін.

У красавіку 1932 года Цэнтральны Камітэт партыі прыняў пастанову «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый». «Цяпер, — гаварылася ў дакуменце, — калі паспелі ўжо вырасці кадры пралетарскай літаратуры і мастацтва... рамкі існуючых пралетарскіх літаратурна-мастацкіх арганізацый... становяцца ўжо вузкімі і тармозяць сур'ёзны размах мастацкай творчасці. Гэта акалічнасць стварае небяспеку ператварэння гэтых арганізацый са сродкаў найбольшай мабілізацыі савецкіх пісьменнікаў... вакол задач сацыялістычнага будаўніцтва, у сродак культывавання гуртковай замкнёнасці, адрыву ад палітычных задач сучаснасці і ад значных груп пісьменнікаў, якія спачуваюць сацыялістычнаму будаўніцтву. Адсюль неабходнасць адпаведнай перабудовы літаратурна-мастацкіх арганізацый і расшырэнне базы іх работы».

Стала відавочнай важнасць аб'яднання ўсіх літаратараў, якія падтрымліваюць платформу Савецкай улады ў адзіны Саюз савецкіх пісьменнікаў. У 1934 годзе ён быў створаны. Першым яго кіраўніком стаў М. Горкі.

У 30-я гады ўзніклі таксама Саюзы кампазітараў і архітэктараў. Затым — кінематаграфістаў, мастакоў, журналістаў. Роля творчай інтэлігенцыі, аб'яднанай у добраахвотныя саюзы, стала няўхільна ўзрастаць.

Дзякуючы творчым саюзам і арганізаваным пры іх фондам — Літаратурнаму, Мастацкаму і г. д. — пісьменнікі, мастакі, кампазітары — і не толькі вядомыя — атрымалі магчымасць цалкам прысвяціць сябе любімай справе, не турбуючыся пра матэрыяльны бок: падтрымка партыі, дзяржавы і творчага саюза былі ім забяспечаны. Без усякага перабольшання можна назваць гэтыя фонды з'явай унікальнай, характэрнай толькі для СССР, яркім прыкладам сацыялістычнай дэмакратыі ў дзеянні. Аб падобных арганізацыях, як неаднаразова заяўлялі заходнія пісьменнікі, мастакі, акцёры, што наведвалі Савецкі Саюз, яны могуць толькі марыць.

КПСС бачыць сваю задачу ў тым, каб забяспечваць самыя спрыяльныя ўмовы для развіцця мастацтва. У гэтым, уласна кажучы, і заключаецца прынцып партыйнасці ў мастацтве. Ён заклікае мастацкую інтэлігенцыю жыць справамі і задумамі свайго народа, не аддзяляць свой творчы лёс ад інтарэсаў Радзімы.

«Пра нас, — сказаў Міхаіл Шолахаў, — за мяжой гавораць, быццам бы пішам мы па ўказцы партыі. Справа крыху інакшая: кожны з нас піша па ўказцы свайго сэрца, а сэрцы нашы належаць партыі і роднаму народу, якім мы служым сваім мастацтвам».

Гаўрыіл ПЕТРАСЯН.

І ПРОСТАЯ СЯЛЯНСКАЯ ХАТА, І КНЯЖАЦКІ ПАЛАЦ ПАЧЫНАЛІСЯ З ДЗВЯРЭЙ

«ВІЗІТНАЯ КАРТКА» БУДЫНКА

З чаго пачынаецца дом? «Вядома, з дзвярэй», — адкажаце вы. І не памыліцеся. Шматлікія дзверы, шкляныя і драўляныя, металічныя і фанерныя кожны дзень упускаюць і выпускаюць нас у пакой і з пакоя, у хату і краму, у аўтобус і тралейбус, у самалёт і каюту цеплахода. І ўсё ж самымі распаўсюджанымі і старадаўнімі з мноства існуючых з'яўляюцца дзверы, якія вялі ў жытло: у простую сялянскую хату і шыкоўны княжацкі палац.

Яны павінны былі адпавядаць цэламу шэрагу патрабаванняў: не пускаць у жылое памяшканне зімовую сцюжу і халодны восеньскі вецер, надзейна ахоўваць маёмасць гаспадара ад рабаўнікоў, паказваць веліч палаца альбо храма, быць надзейнай абаронай ад ворагаў.

Уявіць памеры і знешні выгляд дзвярэй у дамах простых гарадскіх жыхароў у XII—XVI стагоддзях дапамагаюць археалагічныя раскопкі. Яны сведчаць, што ў дамах старажытнага Мінска дзверы мелі невялікія памеры: іх вышыня дасягала ўсяго 1—1,2 метра, знаходзіліся блізка ад столі і адчыняліся ўнутр памяшкання. Палотны дзвярэй, знойдзеныя падчас раскопак Віцебска, збіраліся з дзвюх альбо трох тоўстых дошак, якія былі замацаваны паміж сабою драўлянымі планкамі. Гэтыя планкі ішлі альбо паралельна адна другой, альбо наўскос. Ніякіх аздабленняў гэтыя дзверы не мелі і выконвалі звычайную утылітарную функцыю.

Значна адрозніваліся ад іх дзверы палацаў і храмаў. Першыя з дзвярэй гэтага тыпу, якія захаваліся да нашых дзён, адносяцца да XVII—XVIII стагоддзяў. Уражваюць сваёй прыгажосцю разныя дзверы ў будынку касцёла ў вёсцы Крамяніца Гродзенскай вобласці. Яны складаюцца з двух вялікіх драўляных палотнаў, якія ўстаўлены ў мураваны дзвярны праём, завершаны паўцыркульнай аркай. Ніжнія часткі абодвух палотнаў аздоблены шыкоўнай разьбой, якая выканана ў стылі «чатырохчленнай сіметрыі», калі дастаткова мець толькі чвэрць складанага геаметрычнага альбо расліннага арнамента, каб уявіць кампазіцыю ўсяго малюнка. Такі арнамент быў шырока распаўсюджаны ў беларускім кафлярстве ў першай палове XVII стагоддзя.

Выклікае цікавасць здымак дзвярэй XVII стагоддзя, які быў зроблены ў Магілёве адразу пасля мінулай вайны і зараз захоўваецца ў архіве рэстаўрацыйных майстэрань.

На ім адлюстраваныя аднастворчатыя драўляныя дзверы, аздабленне якіх складаецца з дзвюх частак. У верхняй — выява аднагаловага арла, магчыма, запазычанага з герба Рэчы Паспалітай (у склад якой тады ўваходзіў Магілёў), а ніжняя, найбольш цікавая, уяўляе сабой малюнак «букета кветак у вазоне» — матыву вельмі характэрнага для розных жанраў беларускага мастацтва: кнігадрукавання, кафлярства, разьбы па дрэву, ткацтва. Несумненна, што гэтыя дзверы вялі ў дом заможнага магілёўскага купца альбо рамесніка.

Вонкавыя дзверы многіх палацаў і храмаў, акрамя разных упрыгажэнняў, маюць і шматлікія металічныя каваныя аздобы. Найбольш пашыраныя ў той час былі каваныя дэкаратыўныя цвікі, пляшкі якіх рабіліся ў выглядзе разнастайных разетак. Гэтыя цвікі забіваліся ў вялікай колькасці, ствараючы разнастайныя ўзоры, а канцы з другога боку загіналіся, тым самым значна павялічваючы трываласць дзвярэй.

У гэты час з'яўляюцца металічныя каваныя завесы, што паступова замянілі старадаўні спосаб навешвання дзвярэй на калаўроце. Канцы завесаў фігурна раскоўвалі і надавалі ім абрысы лістоў, ромбаў альбо выгіналі ў выглядзе лацінскай літары S.

У культавых пабудовах і багатых палацах вонкавыя дзверы мелі вялікія спружынныя замкі, якія замыкаліся каванымі ключамі. Правушыны такіх замкоў аздабляліся дэкаратыўнымі накладкамі, прычым найбольш распаўсюджанымі былі розныя варыянты сэрцападобнай формы.

На рубяжы XIX—XX стагоддзяў амаль усе дзверы ў горадзе і вёсцы ўпрыгожвалі фігурныя каваныя дзвярныя клямкі. Яны выкарыстоўваюцца і сёння.

У старых кварталах многіх беларускіх гарадоў захавалася шмат філёнчатых драўляных дзвярэй. Іх разнастайнае аздабленне, падпарадкаванае тагачасным стылям — класіцызму, эклектыцы і мадэрнізму — сёння можа быць прадметам спецыяльнага вывучэння, асабліва ў сувязі з рэстаўрацыяй старой гарадской забудовы. Таму ў час шматлікіх капітальных рамонтаў стараюцца захаваць такія дзверы, каб не даць загінуць своеасаблівым «візітным карткам» старых пакояў і будынкаў.

Алег ТРУСАЎ.

НА ЗДЫМКАХ: дзверы аднаго з будынкаў Магілёва. XVII стагоддзе; дзверы са слонімскага касцёла св. Андрэя. XVIII стагоддзе.

Фота аўтара.



Цікава праводзіць выхадныя дні моладзь Смалявіцкага раёна. Месцам чарговага збору юнакі і дзяўчаты выбралі маляўнічае ўрочышча Тумель. Моладзь спаборнічала ў пераадоленні перашкод, арыентаванні на мясцовасці, удзельнічала ў конкурсе на лепшую насценную газету, на самы смачны абед. І, вядома, не абышлося без песні ля кастра. НА ЗДЫМКАХ: у гасцях у турыстаў ветэран Вялікай Айчыннай вайны падпалкоўнік у адстаўцы Фёдар ШКУНОЎ; конкурс на лепшы нумар мастацкай самадзейнасці выклікаў вялікі інтарэс у моладзі; ідуць спаборніцтвы па пераадоленню воднай перашкоды.

Фота В. АЛЯШКЕВІЧА.



ВЫНІКІ ВІКТАРЫНЫ «ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА: ЯК КАВАЛАСЯ ПЕРАМОГА»

Сёлета ў маі народы нашай Радзімы ўрачыста адзначалі 40-годдзе перамогі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў. Напярэдадні гэтага вялікага свята Беларускае таварыства «Радзіма» і рэдакцыя газеты «Голас Радзімы» прапанавалі замежным суайчыннікам прыняць удзел у віктарыне «Вялікая Айчынная вайна: як кавалася перамога».

Пытанні віктарыны былі даволі складанымі. Каб адказаць на іх, трэба было прагледзець шмат разнастайнай даведачнай і мемуарнай літаратуры. Прыемна адзначыць, што нашы землякі добра справіліся з гэтай няпростай задачай.

На працягу некалькіх месяцаў мы атрымалі мноства адказаў ад землякоў з розных краін. Уважліва разгледзеўшы іх, журы прызнала пераможцамі наступных удзельнікаў віктарыны:

1-е месца прысуджана Марыі ГАРОХ (Бельгія). Яна ўзнагароджваецца 10-дзённай паездкай у БССР па запрашэнню Беларускага таварыства «Радзіма».

2-е месца — Юрый РАСАДЗІНСКІ (Аўстралія) і Антон МІШЧУК (Аргенціна). Яны будуць узнагароджаны каштоўнымі падарункамі.

Заняўшым 3-е месца — Васіль ЕСІС (Канада), Касум ВАЛІЕЎ (ФРГ), Фрыда ПІДГАЙНАЯ (Аўстралія), Яўген УШКОЎ (ЗША) і Рыгор АПЛЕВІЧ (Канада) — будуць высланы мастацкія альбомы аб Беларусі ці камплект энцыклапедыі БССР.

Журы віктарыны прысудзіла таксама некалькі заахвочвальных прызоў. Кнігі аб Вялікай Айчыннай вайне атрымаюць: Міхаіл МАДОРНЫ (ФРГ), Уладзімір САЦ (Польшча), Кацярына МІЧКО (Францыя), Іосіф КАЗАК (Канада) і Міхась ВІШЧАНКА (Польшча).

Журы віктарыны адзначае, што ўсе адказы суайчыннікаў былі глыбокімі па зместу, паказалі добрае веданне гісторыі Радзімы. І хоць не кожны стаў прызёрам, не сумняваемся, што ўдзел у віктарыне прынёс карысць усім, хто даслаў адказы, расшырыў іх кругагляд і ўзбагаціў новымі ведамі.

Мы сардэчна віншуем пераможцаў і прызёраў віктарыны «Вялікая Айчынная вайна: як кавалася перамога», ад душы дзякуем усім прыслаўшым адказы і жадаем ім поспехаў у нашых наступных конкурсах.

ПРЭЗІДЫУМ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА».
РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ГОЛАС РАДЗІМЫ».

Гумар

Жонка першы раз садзіцца за руль машыны і кажа мужу:

— Усё добра, акрамя гэтага люстэрка.

— Чаму?

— Яно ўстаноўлена няправільна, я бачу ў ім не сябе, а нейкія машыны, што едуць ззаду.

●

Парушальніка правіл руху спыніў паставы:

— Чаму вы едзеце са скорасцю сто кіламетраў у гадзіну?

— Якую гадзіну? — здзівіўся вадзіцель.— Я за рулём усяго пятнаццаць мінут!

●

— Гэты пешаход — самазабойца. Ты бачыш — ён ужо даўно бяжыць перад нашай машынай? Што рабіць? — нервуецца жонка.

— З'язджай з тратуара на праезджую частку,— адказвае муж.

●

— Ці не скажаце, як даехаць да замка караля Яна Сабескага?

— Скажу, але вам можна не спяшацца — ён ужо даўно там не жыве.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-5, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80; 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1178